ДЭПАРТАМЕНТ ПА АРХІВАХ І СПРАВАВОДСТВУ
МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ

# БЕЛАРУСКІЯ АРХІВЫ НА МЯЖЫ ТЫСЯЧАГОДДЗЯЎ: ЗДАБЫТКІ І СТРАТЫ

Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі,
прысвечанай 80-годдзю
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

(Мінск, 28 чэрвеня 2018 г.)

Мінск
БелНДІДАС
2019

УДК 930.25(476)(082)
ББК 79.3(4Беи)я43
Б43

Р э д а к ц ы й н а я к а л е г і я:
*В. І. Кураш* (старшыня), *А. А. Каваленя, В. Ф. Голубеў, В. В. Даніловіч, А. Б. Доўнар, Д. В. Лісейчыкаў, Д. Ч. Матвейчык, Д. У. Яцэвіч*

Р э ц э н з е н т ы:
кандыдат гістарычных навук *А. Я. Рыбакоў*
кандыдат гістарычных навук *М. Ф. Шумейка*

ISBN 978-985-7131-29-7

© Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі», 2019
© Афармленне. Установа «Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы», 2019

4. Volumina legum : przed. zbioru praw staraniem XX. Pijarow w Warszawie od roku 1732 do roku 1782 wydanego. – Kraków : Nakł. Akad. Umiejętności, 1889. – T. 9. – 503 s.
5. Доўнар, А. Б. Рэнавацыйны прывілей Радуні 1792 г. : змест, кошт, значэнне // Вестник МГИРО. – Октябрь–декабрь 2016 г. – № 5 (28). – С. 45–50.
6. НГАБ. – Ф. 146. – Воп. 3. – Спр. 22. – Справа Слуцкай камісіі для разбору ўзаемных правоў і абавязкаў жыхароў г. Слуцка з вотчыннымі ўласнікамі князямі Радзівіламі. Ч. 5 (Інвентары г. Слуцка, бірчак Слуцкай зямельнай касы і інш. дакументы). – 1683–1839 гг. – Арк. 3360–3911.
7. НГАБ. – Ф. 146. – Воп. 3. – Спр. 23. – Справа Слуцкай камісіі для разбору ўзаемных правоў і абавязкаў жыхароў г. Слуцка з вотчыннымі ўласнікамі князямі Радзівіламі. Ч. 6 (Прывілеі, бірчакі, выпісы з кніг Слуцкага магістрата і інш. дакументы). 1587–1821 гг. – Арк. 3912–4706.
8. НГАБ. – Ф. 1825. – Воп. 1. – Спр. 7. – Актавая кніга Слуцкага магістрата. 1789–1793 гг. – 79 арк.
9. Стрэнкоўскі, С. П. Гарадское самакіраванне на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIV–XVIII ст.: у 2 ч. – Мінск : Мін. гар. ін-т развіцця адукацыі, 2013. – Ч. 1. – 589, [1] с.
10. Стрэнкоўскі, С. П. Прывілеі на самакіраванне гарадскім паселішчам Беларусі 1791–1792 гг. // Працы гістарычнага факультэта БДУ. – 2016. – Вып. 11. – С. 84–100.

Я. С. Глінскі

## БАЯРЫ ПЕЧУРАНСКАГА ВОЙТАЎСТВА Ў XVIII – ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XIX ст.

У XVIII ст. баяры як асобная група вясковага насельніцтва, прамежкавая паміж ваенна-служылымі зямянамі і чыншава-паншчынным сялянствам [34, s. 88], па сваім сацыяльным статусе набліжалася да апошняга. Прынамсі, такое меркаванне пануе ў гістарыяграфіі. Яно грунтуецца на паступовым сціранні баярскіх асаблівасцей у павіннасцях [1] – асноўным абавязкам баяр рабілася выплата чыншу, таксама яны прыцягваліся да выканання дадатковых павіннасцей, часам нават паншчыны [24, с. 69; 25, с. 11–12; 29, с. 159–160;

[1] Традыцыйна асноўнай з іх былі дастаўка і суправаджэнне карэспандэнцыі і грузаў [24, с. 55; 26, с. 200].

31, s. 83–84; 34, s. 89]. У меншай ступені ўвага надавалася самаўсведамленню сябе з боку баяр – ці захоўвалі яны памяць пра свой адносна прывілеяваны статус і як да яго ставіліся ўласнікі зямлі, на якой баяры пражывалі. Шмат у чым такое становішча абумоўлена адсутнасцю крыніц – інвентары і іншая гаспадарчая дакументацыя мала прыдатныя для такога кшталту даследаванняў. У такім выпадку ўяўленні баяр пра сябе можна прасачыць рэтраспектыўна – па матэрыялах, якія ўтварыліся ў выніку «разбору шляхты» ў канцы XVIII–XIX ст. Такая даследчая перспектыва дазволіць вызначыць, ці адносілі сябе баяры да прывілеяванага саслоўя, а галоўнае, ці меліся ў іх магчымасці для замацавання ў яго шэрагах.

У якасці мікрарэгіёна, населенага баярамі, намі абрана размешчанае на гістарычнай Капыльшчыне Печуранскае войтаўства, якое складалася з дзвюх вёсак – уласна Печураны [2] і Леўнішчавічы (інакш Мыслі) [3] – і ў XVIII ст. адносілася да «сталовых маёнткаў» уніяцкіх мітрапалітаў. Захаваліся два інвентары Печуранскага войтаўства – за 1748 і 1786 гг. [19, арк. 1260 адв.–1261, 1300 адв.–1303] [4], якія дазваляюць прасачыць склад насельніцтва і яго павіннасці ў заключны перыяд існавання Рэчы Паспалітай. У 1748 г. адзінай занатаванай павіннасцю печуранцаў з'яўляўся чынш, які яны павінны былі выдаваць калектыўна (300 злотых з 34 дымоў у Печуранах і 7 у Леўнішчавічах) [19, арк. 1260 адв.–1261], у 1786 г. чынш быў падзелены на асобныя гаспадаркі (па 40 злотых з кожнай), апрача таго, баяры мусілі ўдзельнічаць у транспартаванні грузаў з Кёнігсбергу ў размешчаны на Кіеўшчыне Радамышль (да Печуранаў іх давозілі баяры з іншага мітрапаліцкага маёнтка – Руты) [19, арк. 1303 адв.–1304 адв.].

У цэлым, па стане на 1748 і 1786 гг. печуранскія баяры па сваіх павіннасцях мала адрозніваліся ад іншых мітрапаліцкіх баяр – адно толькі, у адрозненні, напрыклад, ад руцкіх баяр, яны не выконвалі гвалтаў, затое на іх накладаўся большы чынш (у Руце плацілі не 40, а 20 злотых).

---

[2] Цяпер Печураны – вёска Пацейкаўскага сельсавета Капыльскага раёна Мінскай вобласці Рэспублікі Беларусь.

[3] Цяпер Мыслі – вёска Пацейкаўскага сельсавета Капыльскага раёна Мінскай вобласці Рэспублікі Беларусь.

[4] Выказваю падзяку кандыдату гістарычных навук, намесніку дырэктара НГАБ Дзянісу Лісейчыкаву за зварот увагі на дадзеныя інвентары.

У шэрагах жыхароў Печуранаў і Леўнішчавічаў вылучаюцца некалькі найбольш шырокіх і сталых родаў, змены ў становішчы якіх і будуць асобна разгледжаны ў артыкуле. Гэта прысутныя ў абодвух інвентарах у колькасці больш за адну сям’ю Дзенісевічы, Журыды, Мыслі, Тарасевічы і Ярмаковічы [5]. Прадстаўнікі большасці гэтых стабільна баярскіх родаў зрабілі першы крок да замацавання ў шляхецкім стане ўжо ў 1796 г., калі былі ўнесены ў алфавітную ведамасць шляхты Нясвіжскага павета Мінскай губерні [6]. Усе яны па-ранейшаму пражывалі ў межах Печуранскага войтаўства, якое, праўда, у гэты час адносілася да казённых маёнткаў. Тарасевічы з уласным прозвішчам былі запісаны як чыншавая шляхта [4, арк. 136–139], Дзенісевічы ў гэты спіс не трапілі наогул, а іншыя «падкарэкціравалі» ўласныя прозвішчы. Журыды сталі Жаўрыдамі (дзеці і ўнукі Данілы і Стэфана ў 1786 г. паказаны ў інвентары як Журыды, а ў 1796 г. ужо як Жаўрыды) [4, арк. 161 адв.–162]. У сваю чаргу, Мыслі ў 1796 г. былі запісаны як Мусніцкія (!) [4, арк. 85 адв.–88], а Ярмаковічы пазначылі сябе як Ярмалінскія (!) [4, арк. 38 адв.–45]. Апрача аднолькавага месца жыхарства, тоеснасць гэтых людзей праяўляецца ў імёнах і складзе сямей. Напрыклад, у 1786 г. у Леўнішчавічах жыў баярын Ян Мысля з сынамі Алесем і Юзафам, у 1796 г. тамсама фіксуецца ўжо чыншавы шляхціц Ян Сільвестравіч Мусніцкі з такімі ж старэйшымі сынамі [4, арк. 85 адв.–86]. У 1786 г. у Печуранах паказаны баярын Тэадор Ярмаковіч з сынам Прохарам, у 1796 г. гэта ўжо чыншавы шляхціц Тодар Стэфанавіч Ярмалінскі з такім самым старэйшым сынам [4, арк. 40 адв.–41].

Алфавітная ведамасць 1796 г. складалася падчас падачы мясцовай шляхты звестак аб сабе на разгляд павятовых маршалкаў, для ўключэння ў яе шляхце патрабавалася прадставіць дакументы аб высакародным паходжанні. Відавочна, печуранскія баяры іх не мелі. Ужо ў інвентары ад 1748 г. адзначалася, што зямлю яны трымаюць не на падставе дакументаў, а *«са слоў мясцовага войта»* [19, арк. 1260 адв.]. У XIX ст. Ярмалінскія (былыя Ярмаковічы) і Тарасевічы пры «разборы шляхты» ў якасці доказу апелявалі да пасведчання адміністратара мітрапаліцкіх маёнткаў Францішка Растоцкага, дадзенага 15 верас-

[5] Прадстаўнікі іншых родаў праходзілі па інвентарах спарадычна. Напрыклад, у 1748 г. былі паказаны дзве сям’і Невяроўскіх, а ў 1786 г. носьбітаў гэтага прозвішча ў Печуранах ужо няма. У сваю чаргу, у 1786 г. упершыню паказаны асобныя сем’і Пятроўскіх, Красоўскіх, Мацкевічаў, Давідоўскіх і інш.

[6] Пасля 1797 г. Печураны і Леўнішчавічы ўвайшлі ў склад Слуцкага павета.

ня 1795 г. жыхарам Печуранаў і Леўнішчавічаў, што яны з’яўляюцца «шляхетна народжанымі», а іх дакументы страчаны падчас ліхалеццяў [7, арк. 571 адв.–572; 8, арк. 446; 16, арк. 4–5]. Гэтае пасведчанне вядома толькі ў выпісе са Слуцкага земска-павятовага суда, нельга выключаць магчымасці, што яно магло быць сфальсіфікавана. Але сам факт адсутнасці ў печуранцаў любых сапраўдных дакументаў, якія пацвярджалі б іх шляхецкае паходжанне, несумненны. Менавіта нястача доказаў прымушала іх да скажэння родавых прозвішчаў. Гэта выразна бачна на прыкладзе Ярмаковічаў-Ярмалінскіх. Пры доказе шляхецтва ў 1815 г. яны выводзілі сябе ад Яна Ярмалінскага, які атрымаў у сярэдзіне XVII ст. наданні ў Чарнігаўскім ваяводстве [7, арк. 567 адв.–568]. Больш ніякіх дакументаў у іх не мелася. Цяжка сказаць, адкуль яны атрымалі дакументы на імя Ярмалінскіх, але менавіта іх наяўнасць выклікала змяненне прозвішча. Падобную схему выкарыстала і зямяне Ярмаліцкія, якія пражывалі ў Слуцкім княстве (пераважна ў засценках Радкава Прускага і Сорагі Урэцкага двароў [18, арк. 1–10 адв.]). Яны таксама пачалі выводзіць сябе ад Яна Ярмалінскага і ў выніку мадыфікавалі прозвішча [18, арк. 142–145 адв., 200]. Супольная стратэгія змены прозвішча печуранскімі баярамі Ярмаковічамі і слуцкімі зямянамі Ярмаліцкімі вымушае паставіць пытанне аб магчымасці іх супольнага паходжання. Яно набывае яшчэ большае падмацаванне, калі ўлічыць, што ў канцы XVII ст. у размешчаным непадалёк ад Печуранаў капыльскім засценку Каменка жылі радзівілаўскія зямяне Ярмаліцкія, а пасля Паўночнай вайны яны там не згадваюцца [2, арк. 61 адв.–62]. Магчыма, капыльскія Ярмаліцкія перасяліліся ў Печураны, дзе па нейкіх прычынах іх прозвішча трансфармавалася ў Ярмаковічы. Аднак такая версія выклікае сумненні. Ужо ў 1748 г. Ярмаковічы былі ў Печуранах надзвычай разгалінаваным родам – яны пазначаны гаспадарамі ў 16 дымах (зрэшты, некаторыя дымы маглі належаць адным і тым жа людзям) [19, арк. 1260 адв.–1261]. Такая шматлікасць, верагодна, сведчыць пра іх старадаўняе і сталае пражыванне ў Печуранах.

Пасля першых незацвярджэнняў Сенатам Ярмаковічы-Ярмаліцкія ў 1849 г. падалі комплекс фальшывых дакументаў (на валоданне маёнткам Ясеншчына Мазырскага павета), на падставе якіх зацвердзіліся ў дваранстве ў 1858 г. [7] [17, арк. 42–43 адв., 103–104].

---

[7] Указ распаўсюджваўся не на ўвесь род, а толькі на пэўныя галіны. Астатнія затым зацвярджаліся ў асобным парадку.

Крыху складаней адбывалася змена прозвішча ў выпадку роду Мысляў з вёскі Леўнішчавічы. Як ужо адзначалася, у 1796 г. яны запісаліся Мусніцкімі, але пры падачы вывада дваранства ў 1806 г. ужо фігуравалі як Мысліцкія [6, арк. 135–140 адв.]. У гэтым выпадку змяненне прозвішча было абумоўлена тым, што вывад яны рабілі супольна з больш заможнымі клецкімі зямянамі Мысліцкімі, якія трымалі зямлю ў засценку Заастравечча. У якасці свайго продка леўнішчавіцкія Мыслі-Мысліцкія называлі клецкага зямяніна Яна Мысліцкага і яго сыноў Мікалая, Аляксандра і Антонія. Гэта штучнае паходжанне. Так, сынам Мікалая Янавіча Мысліцкага ў вывадзе названы леўнішчанін Павел Мысля-Мысліцкі. У рэчаіснасці, як сведчыць алфавітная ведамасць ад 1796 г., ён быў сынам Сільвестра Мыслі. Апошні ў 1748 г. (з імем у форме Сільвей) трымаў менш за валоку зямлі ў Леўнішчавічах. Тое ж самае назіраецца ў выпадку Базыля Мыслі – у вывадзе ён называецца сынам таго ж Мікалая, у рэчаіснасці яго бацькам быў Канстанцін, які ў 1748 г. трымаў палову валокі ў Леўнішчавічах (запісаны як Кастусь) [4, арк. 85 адв.–86; 19, арк. 1261]. Аднак нельга выключаць, што клецкія Мысліцкія былі якраз адгалінаваннем печуранскіх Мысляў. У інвентарах Клецкага княства XVII ст. носьбіты гэтага прозвішча не сустракаюцца [28, с. 289–293], магчыма, яны якраз перабраліся ў Клецкае княства з Печуранскага войтаўства, але доказаў гэтага, на жаль, не маецца.

Менш складаны спосаб шляхецкай легітымацыі абралі Журыды. Ужо ў 1802 г. яны падалі супольны вывад з зямянамі Жаўрыдамі (прозвішча якіх і ўзялі) з суседняга маёнтка Грозава [5, арк. 235–238 адв.; 23, с. 202–204] і ў выніку былі зацверджаны ў дваранстве [12, арк. 218]. У цэлым, з улікам падабенства прозвішчаў і блізкіх месцаў пражывання супольнае паходжанне печуранскіх Журыдаў і грозаўскіх Жаўрыдаў не выклікала б сумненняў, калі б у сумежных мясцовасцях не фіксаваліся іншыя носьбіты прозвішча ў форме Журыд. Так, у канцы XVII ст. у прыналежнай да маёнтка Магільна вёсцы Касцяшы сярод прыгонных сялян быў прысутны Пётр Журыд [20, арк. 49 адв.]. Зрэшты, і грозаўскія Жаўрыды былі выхадцамі з панцырнага баярства [33, s. 180] і толькі ў XVII ст. дасягнулі зямянскага статусу, таму пэўныя адгалінаванні роду маглі застацца на баярскай службе і нават перайсці на сялянскія павіннасці.

У вывадзе Тарасевічаў ад 1817 г. чатыры браты (Рыгор, Антоні, Сымон і Прохар) называліся сынамі рэчыцкага шляхціца, застаўнога

трымальніка фальварка Пятровічы Яна Тарасевіча [8, арк. 444 адв.–445; 15, арк. 1]. Тое, што яны былі сынамі Яна пацвярджаецца алфавітнай ведамасцю ад 1796 г. [4, арк. 136 адв.–138]. Іншая справа, што іх бацькам быў паказаны ў інвентары ад 1748 г. печуранскі баярын Ян (Янка) Тарасевіч [19, арк. 1260 адв.]. Адкуль печуранскія Тарасевічы або прадстаўнікі іх інтарэсаў [8] здабылі інфармацыю пра Яна Тарасевіча з Рэчыцкага павета і яго бацьку Сымона (жыў у Мазырскім павеце), пакуль не высветлена. Больш зразумелы механізм, якім скарысталіся Тарасевічы (Тарасовічы) з іншай баярскай вёскі – Сцяпуры (з'яўлялася часткай маёнтка Цімкавічы). У вывадзе ад 1815 г. яны называлі сваім продкам віцебскага шляхціца Андрэя Тарасевіча, які ў 1712 г. вёў працэс у Галоўным Трыбунале ВКЛ Мінскай кадэнцыі [14, арк. 2–5, 83–88]. У рэчаіснасці іх продак Даніэль Тарасовіч жыў у Сцяпурах яшчэ ў 1690 г. і да віцебскай шляхты дачынення не меў [25, с. 85] [9]. Выпіс жа з кніг Трыбунала ВКЛ сцяпурынскімі Тарасевічамі быў атрыманы ў выніку мэтанакіраваных росшукаў. Паказальна, што ён быў выдадзены з Мінскага земска-павятовага суда ў 1801 г., а не паходзіў з родавага архіва. Верагодна, падобным чынам і печуранскія Тарасевічы атрымалі дакументы на рэчыцкіх аднафамільцаў. Яшчэ адной вартай увагі асаблівасцю падачы дакументаў Тарасевічаў з Печуранаў была асоба, ад імя якой рабіўся вывад (іншымі словамі, той чалавек, які фактычна хадайнічаў аб прызнанні ў дваранстве). У выпадку Тарасевічаў ім быў Ян Антоніевіч [8, арк. 444]. Яго бацька Антоні ў 1786 г. з'яўляўся печуранскім войтам [19, арк. 1301 адв.–1302]. Верагодна, менавіта іх сям'я была нефармальным лідарам роду, таму яе прадстаўнік займаўся доказам шляхецтва.

У сваю чаргу, Дзенісевічы выводзілі сябе ад адпаведнага роду, які паходзіў з Падляшша (пра гэта сведчаць метрычныя выпісы з падляшскіх касцёлаў) [10]. У рэчаіснасці Дзенісевічы (Піліп і Пятрусь) былі печуранскімі баярамі ўжо ў 1748 г. [19, арк. 1240 адв.].

---

[8] Важную ролю ў падрыхтоўцы дакументаў для падачы на разгляд дваранскіх сходаў адыгравалі спрактыкаваныя ў юрыдычных справах адвакаты [30, с. 77].

[9] Цікава, што Даніэль у інвентары названы панам, гэта значыць, нягледзячы на пражыванне ў баярскай вёсцы, ён меў шляхецкі ці зямянскі статус, аднак дакладней яго паходжанне не прасочваецца.

[10] Намі гэтыя звесткі былі некрытычна ўспрыняты ў пакаленным роспісе Дзенісевічаў, надрукаваным у 4-м томе «Гербоўніка беларускай шляхты» [22, с. 279–280].

Як бачым, усе найбольш разгалінаваныя роды печуранскіх баяраў атрымалі першаснае прызнанне ў Мінскім дваранскім дэпутацкім сходзе і ўвайшлі ў склад шляхецкай супольнасці Мінскай губерні [11]. Прынамсі, навакольнымі зямянамі яны, відавочна, успрымаліся як блізкія ці нават роўныя сабе па статусе (пра гэта сведчыць тое, што баяры, як у выпадку Журыдаў і Мысляў, даказвалі дваранства супольна з зямянамі). Апрача таго, такому істотнаму пранікненню печуранцаў у шляхецкую супольнасць у канцы XVIII – пачатку XIX ст. паспрыяла і тое, што яны жылі ў казённым маёнтку. Зразумела, дзяржава ў істотна меншай ступені, чым прыватныя землеўладальнікі, кантралявала тых, хто пражываў на яе землях. Памешчыкі, у сваю чаргу, не заўсёды прыязна ставіліся да спроб баяр ператварыцца ў шляхту. Так, забранне Агінскімі дакументаў у зямян і баяр Рэтаўскага староства ў Жамойці знайшло адлюстраванне нават у вядомых успамінах Зыгмунта Мінейкі [27, с. 39]. Уладальнік размешчанага непадалёк ад Печуранаў маёнтка Цялядавічы Нясвіжскі жаночы бенядыктынскі кляштар у 1825 г. рашуча запярэчыў спробам даказаць шляхецтва з боку мясцовых баяр – Гедрановічаў, Нічыпяровічаў і Цераховічаў [3, арк. 2–3] [12]. Таксама ў адрозненне ад зямян і баяр Слуцкага павета, якія пражывалі на панскіх землях [23, с. 221], баяры з Печуранаў і Леўнішчавічаў у пачатку XIX ст. не вымушаны былі пераязджаць на новыя месцы з мэтай пазбегнуць запісання ў вольныя людзі або нават прыгонныя сяляне. Так, па стане на 1830–1840-я гг. большасць Дзенісевічаў, Журыдаў-Жаўрыдаў, Мысляў-Мысліцкіх, Тарасевічаў і Ярмаковічаў-Ярмалінскіх працягвала арандаваць зямлю ў Печуранах і Леўнішчавічах (Мыслях) [1, арк. 3–10; 9, арк. 310–314 адв.; 10, арк. 283 адв., 287 адв.–289 адв.; 11, арк. 6 адв., 215 адв.–218 адв., 220 адв.; 22, с. 280–282].

У выпадку Печуранскага войтаўства мясцовыя баяры, нягледзячы на адсутнасць істотных адрозненняў ад сялян у выкананні павіннасцей, у XIX ст. здолелі ўвайсці ў склад павятовай шляхецкай супольнасці, а некаторыя нават атрымалі афіцыйнае зацвярджэнне з боку расійскіх улад у дваранскай годнасці. Пры гэтым імкненне да

---

[11] Зрэшты, не ўсе здолелі ў ёй замацавацца. Напрыклад, Тарасевічы так і не атрымалі зацвярджэння ў Дэпартаменце Герольдыі [15].

[12] Зрэшты, гэта не перашкодзіла ім у выніку атрымаць зацвярджэнне Герольдыі ў дваранстве [13; 21, с. 319–327]. Іншыя прыклады імкненняў паноў пазбавіць баяр вольнага статусу гл.: [32, s. 128–131].

атаясамлення сябе са шляхтай у выпадку печуранскіх баяр не падмацоўвалася наяўнасцю адпаведных дакументаў, што прыводзіла да неабходнасці іх фальсіфікавання, а часам нават змянення родавага прозвішча.

## Крыніцы і літаратура


1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 27. – Воп. 5. – Спр. 447. – Люстрацыйнае апісанне казённага засценка Печураны Слуцкага павета. 1841–1843 гг. – 64 арк.
2. НГАБ. – Ф. 27. – Воп. 6. – Спр. 2. – Інвентар Капыльскага княства 1693 г. – 64 арк.
3. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 235. – Справа аб вызначэнні дваранскага паходжання Гедрановічаў, Нічыпаровічаў і Цераховічаў. 1825–1878 гг. – 21 арк.
4. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 1. – Спр. 6. – Алфавітная ведамасць шляхты Нясвіжскага і Пастаўскага паветаў за 1796 г. – 194 арк.
5. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 1. – Спр. 32а. – Пастановы Мінскага ДДС аб дваранстве розных асоб за 1802 г. – 829 арк.
6. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 1. – Спр. 40. – Пастановы Мінскага ДДС аб дваранстве розных асоб за 1806 г. – 183 арк.
7. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 1. – Спр. 62. – Пастановы Мінскага ДДС аб дваранстве розных асоб за 1815 г. – 608 арк.
8. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 1. – Спр. 82. – Пастановы Мінскага ДДС аб дваранскім паходжанні розных асоб за 1817 г. – 988 арк.
9. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 1. – Спр. 217. – Пасямейныя спісы дваран 2-га разраду Слуцкага павета за 1835 г. (літары А–Ж). – 323 арк.
10. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 1. – Спр. 218. – Пасямейныя спісы дваран 2-га разраду Слуцкага павета за 1835 г. (літары З–М). – 349 арк.
11. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 1. – Спр. 220. – Пасямейныя спісы дваран 2-га разраду Слуцкага павета за 1835 г. (літары Т–Я). – 242 арк.
12. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 1056. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Жаўрыдаў. – 547 арк.
13. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 2251. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Нічыпяровічаў. – 495 арк.
14. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 3182. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Тарасевічаў. – 178 арк.
15. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 3194. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Тарасевічаў. – 19 арк.

16. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 3206. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Тарасевічаў. – 205 арк.
17. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 3780. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Ярмалінскіх. – 637 арк.
18. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 3790. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Ярмалінскіх. – 202 арк.
19. НГАБ. – Ф. 531. – Воп. 1. – Спр. 161. – Дакументы на маёнтак Рута Навагрудскага павета. XVI–XIX стст. – 1529 арк.
20. НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 2. – Спр. 4942а. – Дакументы па маёнтку Магільна Нясвіжскай ардынацыі. 1638–1777 гг. – 53 арк.
21. Гербоўнік беларускай шляхты. – Т. 4 : Г / Д. Ч. Матвейчык і інш.; навук. рэд. А. Рахуба. – Мінск : Беларусь, 2016. – 959 с.
22. Гербоўнік беларускай шляхты. – Т. 5 : Д / Я. С. Глінскі і інш.; навук. рэд. А. Рахуба. – Мінск : Беларусь, 2018. – 847 с.
23. Глінскі, Я. С. Зямянская супольнасць вёсак Вужа і Праракаўшчына Слуцкага княства ў другой палове XVII – першай трэці XIX ст. // Архіварыус. – Вып. 15. – Мінск : НГАБ, 2017. – С. 197–233.
24. Доўнар, А. Б. Сяляне-слугі Беларусі другой паловы XVI – сярэдзіны XVIII ст. – Мінск : Беларуская навука, 2007. – 193 с.
25. Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII–XVIII вв. : Владение Сморгонь / Сост. П. Г. Козловский, Е. П. Шлоссберг, Е. Л. Бравер. – Минск : Наука и техника, 1977. – 256 с.
26. Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII–XVIII вв. : Владение Тимковичи / Сост. П. Г. Козловский, Е. П. Шлоссберг, Е. Л. Бравер. – Минск : Наука и техника, 1982. – 216 с.
27. Мінейка, З. З тайгі на Акропаль : Успаміны з 1848–1866 гадоў / Уклад., прадмова, камент. М. Запартыка. – Мінск : Лімарыус, 2017. – 568 с.
28. Пазднякоў, В. С. Клецкая шляхта XVI–XVII стст. (спісы) // Беларускі археаграфічны штогоднік. – Вып. 15. – Мінск, 2014. – С. 275–294.
29. Похилевич, Д. Л. Крестьяне-слуги в Великом Княжестве Литовском в XVII–XVIII веках // Средние века : сборник. – 1962. – Вып. 21. – С. 141–169.
30. Трояновский, К. В. Политика Российской империи в отношении беспоместной шляхты западных губерний : дисс. … канд. ист. наук / НИУ ВШЭ. – Санкт-Петербург, 2017. – 238 л.
31. Hedemann, O. Historja powiatu brasławskiego. – Wilno : Sejmik brasławski, 1930. – XXXI, 483 s.
32. Rychlikowa, I. Deklasacja drobnej szlachty w Cesarstwie Rosyjskim. Spór o «Pułapkę na szlachtę» Daniela Beauvois // Przegląd Historyczny. – 1988. – Z. 1. – S. 121–147.

33. Sienkiewicz, W. Szlachta zależna w Wielkim Księstwie Litewskim od połowy XVII do połowy XVIII wieku. Studium z dziejów feudalizmu litewskiego : maszynopis pracy doktorskiej. – Warszawa, 1982. – 460 s.
34. Wieczorek, W. Z dziejów ustroju rolnego Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVIII w. – Poznań : PTPN, 1929. – 119 s.

О. А. Шуміліна

## РОЛЬ НАЦІОНАЛЬНИХ ІСТОРИЧНИХ АРХІВІВ У ВИВЧЕННІ ТВОРЧОЇ БІОГРАФІЇ МУЗИКАНТІВ XVIII СТОЛІТТЯ (НА ПРИКЛАДІ ЖИТТЄТВОРЧОСТІ МАКСИМА БЕРЕЗОВСЬКОГО)

Вивчення біографії людини, яка жила і працювала у XVIII ст., є надзвичайно відповідальною справою. Можна написати і поширювати викривлені факти, видавши їх за правду, і таку інформацію ніхто не зможе спростувати з відсутності живих свідків. Можна проводити час в архівах і шукати прижиттєві документи, які засвідчують реальні факти життєтворчості і на цій основі відтворити правдиву картину творчої біографії митця. Іноді доводиться займатися історичним ревізіонізмом, оскільки загальновідома біографія митця абсолютно не відповідає тому, що було насправді. Останнє має пряме відношення до одного з найяскравіших представників української музичної культури XVIII ст., Максима Созонтовича Березовського (1745–1777).

Я вивчаю життєтворчість цього видатного музиканта протягом тривалого періоду і можу стверджувати, що інформацію про основні події біографії і про творчість цього митця нам відома не за прижиттєвим документальними джерелами, а за публікаціями початку XIX ст. На той час Березовський вже кілька десятків років як помер. І тому відтворити реальну, правдиву картину життєвих подій і відобразити усю панораму композиторського доробку першим біографам і видавцям XIX ст. не вдалося. Ймовірно, вони не ставили собі таких завдань. Однак саме на ті перші публікації спиралися автори усіх наступних біографій Березовського як на джерело.

Поступово була сформована і дотепер існує дещо викривлена уява про життєтворчість митця. Наприклад, усім відомо, що Березовський був церковним співаком і церковним композитором, що він працю-

# ЗМЕСТ

**Прадмова** . . . . . . . . . . 3

Прывітальнае слова
да ўдзельнікаў канферэнцыі
дырэктара Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі
Яцэвіча Д. У.. . . . . . . . . . . 6

Прывітальнае слова
да ўдзельнікаў канферэнцыі
дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі
Даніловіча В. В. . . . . . . . . . . 7

**Секцыя I**
**Гісторыя архіўнай справы**

*Г. А. Бераставы*

Полацкія абласныя прывілеі
і прывілеі полацкім мяшчанам:
практыкі захоўвання і выкарыстання (XV–XVII стст.) . . . . . . . . . . 9

*З. В. Антановіч*

Вопісы спраў Магілёўскай рымска-каталіцкай
кансісторыі як крыніца па даследаванні
справаводства і архіўнай справы. . . . . . . . . . . 20

*В. С. Пазднякоў*

Справы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў 1835–1855 гг.:
цяжкае дваццацігоддзе . . . . . . . . . . 28

*Т. Ю. Афанасьева*

Архивный фонд рода Слизеней. . . . . . . . . . . 33

*Т. Д. Гернович*

Первые нормативные акты об архивах БССР
(начало 1920-х гг.). . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37

*С. В. Кулинок, М. Н. Скоморощенко*

К вопросу об организации делопроизводства
в Белорусском штабе партизанского движения
в сентябре–декабре 1942 г.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48

## Секцыя II
**Крыніцазнаўства: дакументы XIV–XIX стст.**

*Р. Б. Гагуа*

Акты мірнага дагавора ў Белзе ад 6 снежня 1392 г. як
гістарычная крыніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59

*А. Б. Доўнар*

Прывілей Слуцку 1792 г. на правы «вольнага» горада . . . . . . . . . . . . . . . 69

*Я. С. Глінскі*

Баяры Печуранскага войтаўства
ў XVIII – першай трэці XIX ст.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 75

*О. А. Шуміліна*

Роль національних історичних архівів у вивченні творчої біографії
музикантів XVIII століття
(на прикладі життєтворчості Максима Березовського) . . . . . . . . . . . . . 84

*А. У. Ерашэвіч*

Дакументы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі
як крыніца аб падатках
і падаткаабкладанні на тэрыторыі Беларусі
(канец XVIII – першая палова XIX ст.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 90

*С. В. Мяньчэня*

Сістэма яўрэйскіх малельных школ
і дамоў Віцебскай губерні
ў другой палове XIX – пачатку XX ст.
(паводле матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі). . . .100

*Д. Ч. Матвейчык*

Метрычныя кнігі і спісы парафіянаў сібірскіх касцёлаў з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі як крыніцы па гісторыі ссылкі ўдзельнікаў паўстання 1863–1864 гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .108

*О. В. Червинская*

Документы фондов учебных заведений Витебской губернии как генеалогический источник. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .117

*М. М. Кароль*

Праблематыка міжканфесійных пераходаў у другой палове XIX – пачатку XX ст.: перспектывы даследавання на матэрыялах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .128

**Секцыя III**
**Крыніцазнаўства: дакументы XX ст.**

*С. Н. Рындин*

Борьба с «немецким засильем» в белорусских губерниях в годы Первой мировой войны (по материалам Национальных исторических архивов Беларуси в Минске и Гродно) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .134

*А. У. Дзьячкоў*

Дакументы Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці аб жыцці і дзейнасці артысткі і педагога Паўліны Мядзёлкі . . . . . . . . . .143

*Е. Г. Калечиц, А. В. Колосов*

Неизвестное научное наследие Константина Михайловича Поликарповича – новый источник для изучения палеолита Беларуси и сопредельных регионов. . . . . . . . . . . . . . . . . . .148

*Т. Н. Агеенко*

Собирание и использование документов по национально-государственному строительству в Беларуси (по материалам архивного фонда «Институт истории партии и Октябрьской революции при ЦК КП(б)Б»). . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .159

*Д. А. Дзядзюля*

Дзейнасць часовых органаў кіравання
на тэрыторыі Заходняй Беларусі
(верасень–снежань 1939 г.):
па дакументах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь . . . . . . . . . . . .163

*К. В. Сыцько*

Дакументы парафіяльных установ
Рымска-каталіцкага касцёла ў Беларусі
другой паловы XX ст. як гістарычная крыніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .169

*М. М. Елинская*

Советские государственные награды –
Белорусской ССР, областям, городам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .177

## Секцыя IV
**Беларусіка ў архівах замежжа**

*А. А. Жлутка*

Дакументы прамоцыі Францішка Скарыны
на доктара медыцыны з архіваў Падуі
і рэканструкцыя тэксту яго дыплома . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .191

*Д. В. Лісейчыкаў*

Матэрыялы генеральных візітацый манастыроў
Літоўскай правінцыі базыльянскага ордэна XVIII ст.
у фондах Аўстрыйскай нацыянальнай бібліятэкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .197

*І. Б. Лаўроўская*

Касцёлы і кляштары Берасця Літоўскага XVII–XVIII стст.
у выбраных актах луцкіх і берасцейскіх біскупаў
з дыяцэзіяльнага архіва ў Седльцах. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .216

*Т. М. Заблоцкая*

Дакументы па гісторыі Ордэна піяраў
Літоўскай правінцыі
канца XVII – першай паловы XIX ст.
у архівах Беларусі, Літвы і Расіі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .228

*В. М. Папко*

Матэрыялы па гісторыі Беларусі XIX ст.
у Федэральным архіве г. Кобленца
і Цэнтральным архіве роду Гагенлоэ
ў Нойнштайне (Германія):
перспектывы даследавання і вяртання . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .236

*А. М. Сцебурака*

Падзеі 1812 г. у Беларусі ў святле французскіх дакументаў
Дзяржаўнага Імператарскага сакратарыята:
чаканні і рэчаіснасць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .243

*Ю. М. Снапкоўскі*

Сямейны архіў мінскага губернатара Валерыя Чарыкава
ў Цэнтральным дзяржаўным архіве Самарскай вобласці . . . . . . . . . . . .247

**Секцыя V**
**Сучасныя архіўныя тэхналогіі**

*Г. С. Жолнеркевич*

Расширение доступа к документам
государственных архивов Республики Беларусь:
проблемы и пути решения . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .265

*Г. А. Сівохін, К. І. Мяцеліца*

Метадалагічныя аспекты рэалізацыі другой ступені сістэмы
адкрытага доступу да дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонду
Рэспублікі Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .272

*А. М. Белявский, С. А. Захаркевич*

По ту сторону жизни:
антропологический анализ пространственной
семантики понятия «архив» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .280

*В. С. Іванова*

Вусныя ўспаміны жыхароў беларускай вёскі
аб падзеях другой паловы XIX – пачатку XX ст. . . . . . . . . . . . . . . . . . .294

*Н. С. Гардзіенка*

Да пытання экспертызы каштоўнасці дакументаў беларускай эміграцыі ў фондах Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .306

*В. В. Боровик*

Музей-архив народной культуры Украинского Полесья: особенности формирования архивного фонда документов, найденных в брошенных населенных пунктах зоны отчуждения . . . . . .312

*В. В. Боровик, Г. А. Шамонин*

Некоторые вопросы архивного описания исследовательских собраний этнографических аудиодокументов и создания научно-справочного аппарата к ним . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .322

*О. В. Березовская*

Особенности описания архивной коллекции документов потерянных территорий Чернобыльской зоны отчуждения. . . . . . . . . . .331

*Ю. Б. Твердохлебова, Т. Г. Комлева*

Восполнение газетного фонда Национальной библиотеки Беларуси как необходимое условие обеспечения сохранности отечественного документного наследия. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .339

*Ю. І. Крыўдзюк*

Узаемадзеянне музеяў і архіваў у галіне захавання і прэзентацыі гісторыка-культурнай спадчыны . . . . . . . . . . . . . . . . . .344

**Секцыя VI**
**Архіўныя дакументы і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны**

*Ю. М. Лаўрык*

Тэкставы склад зборніка КП 447 са збораў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь . . . . . . . . . . . .351

*В. А. Кобринец*

К вопросу о русских монетных номиналах на территории Беларуси в XVI–XVII вв. (по данным письменных источников) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .357

*В. У. Шылай*

Да пытання атрыбуцыі і класіфікацыі вокладак актавых кніг XVII ст. з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі . . . . . . . . . . . . .366

*В. В. Урублеўскі*

Зменлівасць беларускіх сялянскіх прозвішчаў у Мінскай губерні (канец XVIII – пачатак XX ст.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .375

*І. Н. Колабава*

Матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі як крыніца па гісторыі фальшываманетніцтва . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .386

*С. А. Рыбчонак*

Матэрыялы з калекцыі графа Канстанціна Ажароўскага ў Нясвіжскіх зборах князёў Радзівілаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .390

*Ю. П. Латушкова*

Материалы по обращению бон Гомельского городского самоуправления из фондов Национального исторического архива Беларуси . . . . . . . . . .404

Звесткі пра аўтараў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .414

Б43 **Беларускія архівы на мяжы тысячагоддзяў: здабыткі і страты** : матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (Мінск, 28 чэрвеня 2018 г.) / рэдкал.: В. І. Кураш (старшыня) [і інш.]. – Мінск : БелНДІДАС, 2019. – 430 с. : іл.

ISBN 978-985-7131-29-7.

У зборніку пададзены тэксты дакладаў удзельнікаў канферэнцыі, праведзенай сумесна Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі і Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі 28 чэрвеня 2018 г. Спектр узнятых праблем беларускімі і замежнымі даследчыкамі дастаткова шырокі – гісторыя архіўнай справы ў Беларусі і дакументальнай спадчыны, выкарыстанне ў навуковых распрацоўках асобных крыніц і іх комплексаў, дасягненні і праблемы развіцця архіўнай справы і гістарыяграфіі на сучасным этапе і інш.

Зборнік прызначаецца для прафесійных гісторыкаў і архівістаў, а таксама краязнаўцаў і ўсіх зацікаўленых мінуўшчынай Беларусі.

УДК 930.25(476)(082)
ББК 79.3(4Беи)я43